І вось, зноў і зноў, штогадова, напярэдадні Вялікага посту, мы ўзгадваем яшчэ адзін аспект Божай міласэрнасці. Бог міласэрны да людзей далёкіх ад яго, даючы ім даброты гэтага свету, але найбольш міласэрны Ён да тых, што вяртаюцца да Яго, прыносячы пакаянне. Іх ён надзяляе дарункамі Духа Святога.

Пасьпяшайма ж прынесці дастойны плод пакаяння, і на станем наракаць на тое, што Гасподзь міласэрны і да злых і да добрых, і да блізкіх і да далёкіх, і да верных і да блудных!

З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода
протаіерэя Ігара Галакава
*Укладальнік: Алесь Спіцын*
Дата выпуску: 28 лютага 2016 г.



МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

ЛЮТЫ, 2016

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

# НЯДЗЕЛЯ АБ БЛУДНЫМ СЫНЕ



## Дарагія браты і сёстры!

Наступае чарговая нядзеля падрыхтоўкі да Вялікага посту і Праваслаўная царква прапануе сваім верным дзецям выслухаць прыпавесць Госпада пра блуднага сына, дзе распавядаецца наступнае: *... у аднаго чалавека было два сыны; і сказаў малодшы бацьку: тата! дай мне належную мне долю маёмасці. І бацька падзяліў ім маёмасць. Праз колькі дзён малодшы сын, сабраўшы ўсё, пайшоў у далёкі край і там распусціў маёмасць сваю, жывучы распусна* (Лк. 15:11-13, пераклад Сёмухі).

І тут найперш варта зноў і зноў узгадаць на колькі добры і найдабрэйшы, міласэрны і найміласэрнейшы наш Гасподзь. Ён дае адчуць радасць і асалоду жыцця не толькі людзям блізкім да Яго, але і людзям духоўна далёкім, тым, хто выбраў "чужую краіну" бязбожнасці. Аб гэтым сказана ў Евангеллі: *любеце ворагаў вашых, дабраслаўляйце кляцьбітоў вашых, рабеце дабро ненавіснікам вашым і малецеся за крыўдзіцеляў вашых і за ганіцеляў вашых; каб сталіся вы сынамі Айца вашага, Які ёсць у нябёсах; бо Ён загадвае сонцу Свайму ўзыходзіць над ліхімі і добрымі і пасылае дождж на праведных і няправедных* (Мацвея 5:44-45) Вялікая, вялікая міласэрнасць Божая (і гэткімі ж Ён заклікае быць і нас). Але даброты гэтага свету, якімі б шчодрымі яны не былі, не здольныя насыціць чалавечую душу так, як насычае праўдзівае сумоўе з Богам. Таму і гаварыцца далей у прыпавесці: *А калі ён пражыў усё, настаў вялікі голад у той краіне, і ён апынуўся ў нястачы; і пайшоў, прыстаў да аднаго жыхара той краіны, а той паслаў яго на палі свае пасвіць свінні; і ён рады быў напоўніць чэрава сваё струкамі, якія елі свінні, але ніхто не даваў яму* (Лк. 15:14-16). Як часта людзі шукаюць паратунку ад тугі ў фальшывых настаўнікаў, у мудрасці гэтага веку, але не знаходзяць у ёй праўдзівага задавальнення, параўнанага хаця б саладосцю бабовага струка, якога "ніхто не даваў яму".

*Апамятаўшыся, сказаў: колькі парабкаў у бацькі майго маюць лішкі хлеба, а я паміраю з голаду! Устану, пайду да бацькі майго і скажу яму: тата! я зграшыў супроць неба і перад табою, і ўжо не варты называцца сынам тваім; прымі мяне ў лік парабкаў тваіх. Устаў і пайшоў да бацькі свайго. І калі ён быў яшчэ далёка, убачыў яго бацька ягоны і ўмілажаліўся; і пабегшы, упаў яму на шыю і пацалаваў яго. А сын сказаў яму: тата! я зграшыў супроць неба і перад табою, і ўжо не варты называцца сынам тваім. А бацька сказаў рабам сваім: прынясеце найлепшую вопратку і апранеце яго, і дайце пярсцёнак на руку яму і абутак на ногі; і прывядзеце ўкормленае цяля і закалеце: будзем есці і весяліцца, бо гэты сын мой быў мёртвы і ажыў, прападаў і знайшоўся. І пачалі весяліцца* (Лк. 15:17-24).